Шыфр:_______________________

Колькасць балаў:______________

Месца:______________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта,
намеснік Міністра адукацыі

_______________В.А. Будкевіч

«13» сакавіка 2014 года

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXX РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Гродна, 2014 г.*

**9 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

## Варыянт I

**Заданне 1.** Падкрэсліце словы (спалучэнні слоў), напісанне якіх адпавядае сучасным арфаграфічным нормам.

Запішыце, у якім годзе быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі».

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

*Сямнаццаць, газпрам, лідар, сторублёвы, ва ўніверсітэце, трыа, дэзінфекцыя, кантрастны, саўна, экземпляр.*

Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» быў прыняты ў ______________.

**Заданне 2.** Устаўце ў сказы прапушчаныя фразеалагізмы з кампанентамі-лічэбнікамі ў адпаведнасці з пазначанымі лексічнымі значэннямі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| **Сказ** | **Значэнне фразеалагізма** |
|---|---|
| 1) Дзянёк быў сонечны, і апранутая ў цёплы кажух Маечка была ______________________________ ад радасці (*У. Краўчанка*). | *‘(быць) бязмерна шчаслівым, вельмі задаволеным’* |
| 2) Гарасім у той час у размове з любой дзяўчынай не мог ______________________________, заікаўся, бляднеў і пацеў (*І. Шамякін*). | *‘(не магчы) звязна выказаць свае думкі’* |

| | |
|---|---|
| 3) – А я дзень пры дні сяджу ___________________ _________________________ і свету белага не бачу, – звычайна скардзіўся Пцічкін (*І. Новікаў*). | *'не выходзячы з дому, з памяшкання'* |

**Заданне 3.** Перакладзіце рэцэпт на беларускую мову, замяняючы інфінітывы дзеясловамі 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу. Лічбы запішыце словамі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Гречневая каша по-радзивилловски**

Приготовить гречневую кашу. В миске перемешать 4 яичных белка и 150 г сахара. Поставить миску в большую кастрюлю с 2 стаканами закипающей воды и взбивать, пока масса не загустеет. Перемешать яичную смесь с кашей и изюмом, положить в смазанную жиром и посыпанную тертой булкой сковороду, запечь в духовке (*Энциклопедия белорусской кухни «Смачна есці»*).

____________________________________________________________________________

**Заданне 4.** Усе вы добра памятаеце беларускія казкі пра жывёл (напрыклад, "Конь і леў", "Журавель і чапля", "Ганарыстая варона", "Як курачка пеўніка ратавала" і інш.) і тое, як звалі персанажаў гэтых твораў.

Запішыце назвы маладых істот, утвораныя ад наступных казачных герояў.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

*Конь* ______________________________
*Леў* ______________________________
*Журавель* __________________________
*Чапля* ____________________________
*Варона* ____________________________

**Заданне 5.** Ад назваў багоў славянскага пантэона[1] ўтварыце прыналежныя прыметнікі. Адказ запішыце ў форме мужчынскага роду адзіночнага ліку.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| Назоўнік | Прыналежны прыметнік |
|---|---|
| *Ярыла* | |
| *Цёця* | |
| *Рада* | |
| *Пярун* | |
| *Жыжаль* | |

**Заданне 6.** Прачытайце. Выдзеленыя ў тэксце займеннікі запішыце ў пачатковай форме. Вызначце разрады займеннікаў паводле іх значэння.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Аднойчы сустрэліся Талент і Імя. Паважна пыхкаючы, Імя кажа:

– Прэч з дарогі, хіба ты не бачыш, хто я?

– Ну ***хто*** ты? – спакойна пытаецца Талент.

– Я – Імя! – з гонарам адказвае ***яно***. – ***Усе*** людзі мяне ведаюць і даюць мне дарогу. А вось хто ты – я штосьці цябе не ведаю.

– Я, – усміхнуўся Талент, – якраз ***тая*** рэч, якой ***табе*** не хапае (*З народнага гумару*).

| Займеннік | Разрад займенніка паводле значэння |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 7.** Уважліва прачытайце тэкст. Выканайце заданні, адкажыце на пытанне.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

(1) *Сухое сена (на ўзгорку ляжалі першыя пакосы) разлівала далёка навокал не толькі густы водар, які п'яніў, але і асаблівую цяплынь, якая ўзнімала настрой, будзіла фантазію, уяўленні і ўспаміны маленства.* (2) *Млявасць была ад нечага іншага,* ***можа****, ад тонкага водару кветак у нізінах ці едкага паху выкінутых на бераг водарасцяў, ілу і малюскаў.*

(3) *Нерухомае возера-старыца нібы застыла, ашклела, люстра яго з незвычайнай яскравасцю адбівала такія ж нерухомыя хмары і дубы.* (4) *Толькі каля травяністага берага нябачныя мошкі ці вадзяныя жукі чарцілі на гэтай гладзі адмысловыя іерогліфы.* (5) *Ніводнага ўсплёску, пакуль Віктар не разбудзіў цішу і гладзь блешняй спінінга.* (6) *І возера ажыло_ разышліся кругі_ быццам несучы*

---

[1] ***Пантэон*** – агульная назва ўсіх багоў у якой-н. рэлігіі.

*сігналы небяспекі_ з травы вылецела качка_ кракнула і ўпала ў лазняках_ пад абрывам плёснула* (Паводле І. Шамякіна).

## ЗАДАННІ І ПЫТАННІ ДА ТЭКСТУ

1. Вызначце і запішыце тып ***першага сказа***.

___

___

2. Растлумачце пунктуацыйнае афармленне выдзеленага ў ***другім сказе*** слова.

___

___

3. Пры дапамозе якога сінтаксічнага сродку сувязі звязаны граматычныя часткі ***пятага сказа***?

___

___

4. Адзначце правільны варыянт пастаноўкі знакаў прыпынку на месцы пропускаў у ***шостым сказе***:

а) двукроп'е, коска, коска, коска, коска;
б) двукроп'е, коска, кропка з коскай, коска, кропка з коскай;
в) коска, коска, коска, коска, коска;
г) працяжнік, коска, кропка з коскай, коска, кропка з коскай;
д) працяжнік, коска, коска, коска, коска.

**Заданне 8.** Пра якія творы ідзе гутарка ў наступных тэкстах? Назавіце твор і яго аўтара. Аформіце свае адказы ў табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

1) Як у знакамітых арабскіх казках "1001 ноч" ёсць стрыжнёвыя персанажы (Шахразада, якая апавядае казкі, і яе слухач – шах), так і ў кнізе пісьменніка розныя сюжэты цэментуюцца вобразамі ўласна апавядальніка-аўтара і яго дзядзькі.

2) Галоўная гераіня апавядання – жанчына, якая 16 год чакае з вайны сына. У вобразе старой Тэклі аўтар раскрывае боль і перажыванні ўсіх жанчын-маці, якія страцілі дзяцей на вайне.

3) Паэма ў дванаццаці былінах з падзагалоўкам "шляхецкая гісторыя 1811–1812 гадоў" пісалася ў эміграцыі. Многае з падзей таго часу помніў аўтар. Яму ж было ўжо чатырнаццаць гадоў, калі войскі Напалеона ўступілі ў Навагрудак.

АДКАЗЫ:

| № п/п | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |

**Заданне 9.** Знайдзіце ў кожным радзе "лішні" элемент. Абгрунтуйце свой выбар.

*Максімальная колькасць балаў – 3 (0,5 – за правільна вызначаны "лішні" элемент; 1 – за абгрунтаванне кожнага выбару).*

1. Барока, рамантызм, гуманізм, класіцызм.

Абгрунтаванне: ______________________________

______________________________

______________________________

2. Раман, партрэт, пейзаж, мова героя.

Абгрунтаванне: ______________________________

______________________________

______________________________

**Заданне 10.** Узнавіце тэкст, уставіўшы прапушчаныя словы. Пісьмова адкажыце на пытанні.

*Максімальная колькасць балаў – 6: **1 бал** – за правільна ўстаўленыя словы;**2 балы** – за адказ на першае пытанне; **1 бал** – за адказ на другое пытанне; **2 балы** – за адказ на трэцяе пытанне (фразеалагізм + значэнне).*

Наш ________________, мілы наш ______________,
У дзіцячым часта быў палоне;
Вось так гуртом яго абсядуць
І час работы яго крадуць;
Насі "катла", кажы ім казкі,
Ідзі на поплаў з імі ў краскі,
Давай адказы на пытанні,
Тлумач ты ім ўсё дазвання:
Адкуль, з чаго дзе што бярэцца,
Вось гэта, тое як завецца
І чаму так, чаму не гэтак?
Прыхілен _____________ быў да дзетак.

**Пытанні і заданні да тэксту:**

1. Вызначце назву твора і яго аўтара.
2. Якім памерам напісаны твор?
3. Знайдзіце ў тэксце фразеалагізм і растлумачце значэнне гэтага ўстойлівага выразу.

**Адказы:**

1) ______________________________________________

2) ______________________________________________

3) ______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________